# Мая Радзіма – Беларусь

Ранюк Малання
ДУА «Гімназія №2 г.Бабруйска»
6 «В» клас

«Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць…» – гэтыя радкі Алеся Ставера ведуць усе. Але я не зусім згодна з думкай паэта. Мне здаецца, што любоў да Радзімы прыходзіць да чалавека з пяшчотнай усмешкай і песнямі маці, з моцнай падтрымкай бацькі, з казкамі і клопатам бабулі, з вясёлымі гульнямі і свавольствамі братоў і сясцёр. Радзіма заўсёды побач.

Мая радзіма, перш за ўсё, мая сям'я. Мая радзіма – мой горад. Мая радзіма – Беларусь. Каб пазнаць яе, адправімся ў маленькае падарожжа.

У нядзелю ў хаце клопатна: мы збіраемся ў вёску. Рыхтуем рэчы, ежу, падганяем адзін аднаго, бо бацькі хочуць як мага раней выехаць з горада.

Нарэшце выходзім на вуліцу. З-за вышынных дамоў караскаецца вясенняе сонейка, каля скамейкі лашчацца каты, чуюцца забіяцкія спевы птушак. Які незвычайны наш горад раніцай! Прыціхлы, задуменны, але такі прыгожы. Мы едзем па плошчы Леніна. Нас быццам вітае застылы ў камяні рэвалюцыянер. Ветліва лунае яркі сцяг на будынку Бабруйскага гарвыканкама, на клумбах першая зеляніна радуе вока. Акуратна пафарбаваныя дамы, магазіны, кавярні мільгаюць за вокнамі. Урачыста і асляпляльна сустракае Белая царква. Мы заязджаем у невялікі завулак і трапляем у гісторыю.

Старыя двухпавярховыя дамы з чырвонай цэглы выглядаюць магутна і велічна. Далей віднеюцца мураваныя сцены казематаў, казармаў. Гэта наша Бабруйская крэпасць – легенда і гонар усіх жыхароў горада. Яна будавалася для абароны ад нападу Напалеона I у 1810 годзе. Яе гісторыя звязана і з дзекабрысцкім паўстаннем 1825 года. Першапачаткова членамі тайных аб'яднанняў і кіраўнікамі дзекабрысцкага паўстання, якія служылі у нашым горадзе, распрацоўваўся «Бабруйскі план» дзяржаўнага перавароту. Але яго не падтрымалі ўсе ўдзельнікі. Пазней тут адбывалі пакаранне некаторыя дзекабрысты. А ў гады Вялікай Айчыннай вайны крэпасць стала месцам суму і смутку: тут быў канцэтрацыйны лагер для савецкіх палонных. Чорныя постаці на помніку ахвярам напамінаюць пра жахлівыя падзеі.

Мы едзем далей, і па абодва бакі «Цітаўскага» маста – рака Бярэзіна. Вецер ганяе яе блакітную ваду, і здаецца, што хвалі выскачаць з берагоў і памчацца гуляць па бясконцых лугах, якія апрануліся ўжо ў пяшчотна-зялёную траўку. А бывае, што рака выходзіць са сваіх берагоў і затаплівае наваколле. Тады невялікія дрэўцы і хмызнякі быццам імкнуцца выбрацца з вадзянога палону.

Якія розныя хаты стаяць уздоўж дарогі! Высокія і нізкія, белыя і цёмныя, некаторыя з іх упрыгожаны разьбой, а некаторыя схіліліся да зямлі сваімі разбуранымі сценамі... Каля адной з іх прагульваецца ганарлівы і свавольны конь.

А вось і наш беларускі лес. Маці просіць бацьку спыніцца і кліча мяне з сястрой пагуляць. На першы погляд, лес самы звычайны, але пасля ўваходу ў яго мы перамяшчаемся ў іншы свет. Шчабечуць птушкі, быццам запрашаюць у госці. Дзяцел будзіць сваім бадзёрым стукам усіх лясных жыхароў. Мы ўдыхаем вясенні пах соснаў і бяроз, праходзім углыб па старым лісці, пакрытым мігатлівай расой. Раптам я спыняюся: на маленькай палянцы бачу нешта незвычайнае. Невялічкая шэрая ножка, пакрытая амаль празрыстым пушком, трымае фіялетавы званочак. Як міла! Што гэта? «Гэта сон-трава, першацвет, занесены ў Чырвоную кнігу», – тлумачыць маці. Чуецца незразумелы шоргат: мыш ці вуж? Мы палахліва вяртаемся да машыны і працягваем шлях.

Вось наша вёска. Чорная дарога вядзе да хаты. У хаце ніхто не жыве зімой, і здаецца, яна сумавала без людзей. На двары я адразу спяшаюся да мястэчка, дзе калісьці пасадзіла расліны. Вось яны, мае маргарыткі! Лісточкі маленькія, ледзь прыкметна выглядаюць з-пад зямлі, але першая ружова-белая кветачка радасна ўсміхаецца мне. Бацькі пачынаюць займацца гаспадарскімі справамі, а мы з сястрой уладкоўваемся на арэлях і проста глядзім у блакітнае неба, па якім плывуць белыя аблокі, падобныя да жывёл і людзей. Якая асалода быць дома!.. У сваёй краіне.

Дык навошта ехаць за мяжу, каб палюбіць Беларусь? Як многа прыгожага і незвычайнага мы бачым на радзіме кожны дзень! У вялікім горадзе ці маленькай вёсцы, на палях ці лугах, у лясах ці рэках мы можам знайсці тое, што прымусіць сэрца біцца ад захаплення, ад радасці, ад гонару за нашу краіну, яе гісторыю, яе народ:

Навокал жыццё расцвітае –
І песня ўзлятае сама:
Мне лепей ад роднага краю
Нічога на свеце няма.